*Партыя ў новых умовах*

# СУСТРЭЧА ПА ПРОСЬБЕ

**На БелАЗе адбылася сустрэча з членам ЦК КПСС, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, другім сакратаром ЦК КПБ А. С. Камаем, арганізаваная парткомам па просьбе камуністаў прадпрыемства. На ёй прысутнічалі і жадаючыя беспартыйныя работнікі завода, а таксама партыйны актыў іншых прадпрыемстваў і арганізацый Жодзіна. Да пачатку сустрэчы Аляксей Сцяпанавіч наведаў цэхі, пагутарыў з людзьмі на іх рабочых месцах.**

— СЕННЯ, калі наша грамадства знаходзіцца на мяжы развалу і чакаецца, калі не выправіць становішча, грамадзянская катастрофа, мы павінны інакш усвядоміць урокі і вывады перамен, якія адбыліся за апошнія гады ў грамадска-палітычнай, сацыяльна - эканамічнай і духоўнай сферах, —так ахарактарызаваў ён становішча. — Ці адказаў на злабадзённыя пытанні рэспубліканскай партарганізацыі XXXI з'езд КПБ? Нельга рабіць паспешлівых вывадаў. На ім прынята адзінаццаць рэзалюцый па асноўных напрамках сацыяльна-эканамічнай і палітычнай дзейнасці. Мяркуючы па змяненнях у структуры ЦК КПБ і тых дакументах, якія выпрацоўваюцца цяпер, можна сказаць, што ў палітычным, арганізацыйным і кадравым напрамках прымяняюцца новыя падыходы. Справа цяпер за практычнай работай.

А. С. Камай быў удзельнікам нядаўняга Пленума ЦК КПСС і ахвотна падзяліўся з прысутнымі ўражаннямі аб яго рабоце.

— Рашэнні прайшоўшага Пленума ЦК КПСС значна адрозніваюцца ад раней прынятых дакументаў. Адчуваецца не толькі заклапочанасць партыі аб хутчэйшым паляпшэнні спраў, а і дакладна сфармуляваны тыя напрамкі прыкладання сіл, на якіх павінна быць засяроджана ўвага ўсяго кадравага патэнцыялу партыі, усіх дзяржаўных структур, каб павярнуць справу на рэалізацыю сацыялістычных прынцыпаў.

Пры гэтым я б выдзеліў дзве асноўныя праблемы. Першая — змяніць становішча спраў на таварным рынку. Стрымаць на пэўным узроўні таварна-грашовыя адносіны і забяспечыць паляпшэнне жыцця людзей.

Што ж робіцца ў рэспубліцы для таго, каб змяніць сітуацыю да лепшага? Прамоўца адзначыў, што і на сесіі Вярхоўнага Савета БССР, і ва ўрадзе рэспублікі ўжо адпрацаваны некаторыя пытанні гаспадарчага механізма. Некальк і палепшылася матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне прамысловых прадпрыемстваў. Так, для лёгкай прамысловасці рэспубліка поўнасцю закупіла на гэты год неабходную колькасць сыравіны. Таму ёсць падставы меркаваць, што прадпрыемствы лёгкай прамысловасці будуць працаваць устойліва і сацыяльны заказ — рост выпуску прадукцыі на 22 працэнты — будзе выкананы.

Прамыя сувязі, якія наладжаны рэспублікай з РСФСР, Украінай, Казахстанам і іншымі рэгіёнамі, выводзяць нас на забеспячэнне матэрыяльнымі рэсурсамі ў межах 90—92 працэнтаў.

Таварны рынак, адзначалася далей, у многім залежыць ад сістэмы цэн. Перакосы з імі прывялі да вывазу за межы рэспублікі вялікай колькасці самых розных відаў тавараў. Паміж нашай рэспублікай і Украінай заключаны дагавор аб устанаўленні прыкладна аднолькавых цэн на восем асноўных відаў харчовых тавараў. Гэта дазволіць забяспечыць кампенсацыю на павышэнне цэн у межах 60 — 65 рублёў на чалавека ў месяц. Але партыя стаіць за тое, каб без папярэдняй выплаты кампенсацыі цэны не павышаліся. Астатнія віды прадуктаў і асноўныя тавары народнага спажывання першай неабходнасці належаць індэксацыі. Паступаюць прапановы розніцу пасля індэксацыі выплачваць з прыбытку прадпрыемстваў, але, як зазначыў А. С. Камай, партыя стаіць за тое, каб частку гэтай сумы выплачваць з агульнадзяржаўнага даходу.

Сакратар ЦК паведаміў прысутным, што з мэтай стабілізацыі спажывецкага рынку з шасцю рэспублікамі заключаны дагаворы на пастаўку ўзамен на нашу прадукцыю тавараў народнага спажывання, спыніўся на праблеме ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, расказаў аб пазіцыі ЦК КПБ і сваёй у адносінах да прыватызацыі і існавання разнастайных форм уласнасці.

Другая вельмі важная праблема, адзначыў ён, на якой цяпер павінны быць сканцэнтраваны намаганні партыі, — як зберагчы ад разбурэння дзяржаўныя структуры і выратаваць Саюз ад развалу.

— Мы за захаванне Саюза, толькі ў новай якасці, з новымі эканамічнымі і палітычнымі ўзаемаадносінамі, якія давалі б магчымасць да канца раскрыцца таленту і здольнасцям беларускага народа, да канца задзейнічаць свой багаты патэнцыял. Рэспубліка павінна мець суверэнітэт эканамічны, палітычны і ў іншых сферах дзейнасці, уключаючы і знешнеэканамічныя сувязі. Аднак ёсць і непарыўныя сувязі, якія зрабілі нашу краіну магутнай дзяржавай. А некаторыя імкнуцца іх парушыць, каб раз'яднаць Саюз. У бліжэйшы час будзе прынята сумесная заява Бюро ЦК КП Беларусі, РСФСР, Украіны і іншых саюзных рэспублік, дзе будзе дакладна акрэслена пазіцыя кампартый, узгодненая праграма дзеянняў камуністаў і ўсяго насельніцтва ў падтрымку Саюзнага дагавора. Іншага выйсця няма, бо можа здарыцца трагедыя не толькі для нас, а і для нашых нашчадкаў.

Дарэчы, у Палітычнай заяве,

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы